■ Грошы

# Якія выплаты зменяцца з наступнага месяца?

**З 1 жніўня па 31 кастрычніка дзейнічае новы бюджэт пражытковага мінімуму — 175 рублёў 50 капеек (на 6 рублёў больш, чым у мінулым квартале). Для працаздольнага насельніцтва БПМ складзе 193,6 рубля, для пенсіянераў — 134,4, для студэнтаў — 170,5. Памер бюджэту для дзяцей да трох гадоў вырасце да 112 рублёў, для малых ад трох да шасці гадоў — амаль да 156 рублёў, для ўзросту 6-18 гадоў — да 191,5 рубля. Адпаведна зьмяняюцца і некаторыя выплаты, якія залежаць ад памеру гэтага нарматыву.**

## Дапамогі на дзяцей

Дапамога пры нараджэнні першынца павялічыцца да 1755 рублёў (гэта 17,5 мільёна недэнамінаваных). Пры з'яўленні другога і наступнага дзіцяці бацькі атрымаюць амаль 2,5 тысячы — на 79 рублёў (ці 790 «старых» тысяч) больш, чым было дагэтуль. Жанчынам, якія сталі на ўлік у дзяржаўных арганізацыі аховы здароўя да 12-тыднёвага тэрміну цяжарнасці, будуць плаціць 175,5 рубля. Крыху павялічацца таксама выплаты для сем'яў, якія адначасова выхоўваюць малога да трох гадоў і дзіця ва ўзросце ад 3 да 18. Ім штомесяц будуць налічваць амаль па 88 рублёў.

## Пенсіі і надбаўкі за ўзрост

Мінімальная працоўная пенсія і надбаўкі за ўзрост павялічацца на 3,3 працэнта. Пажылым, якім споўнілася 75 гадоў, будуць даплачваць да пенсіі амаль па 33 рублі, тым, каму за 80, — па 44 рублі. Вырастуць сацыяльныя пенсіі. Сума штомесячных выплат для інвалідаў 3-й групы складзе 131,6 рубля, для 2-й групы — 149 рублёў (для інвалідаў з дзяцінства на 9 рублёў больш), для 1-й групы — 193 рублі. Сацыяльная пенсія па страце карміцеля на кожнае дзіця са жніўня будзе раўняцца 149 рублям.

## Выплаты на бізнес

Беларусы, якія хочуць адкрыць сваю справу, могуць разлічваць на субсідыю ў 1930 рублёў (19,3 мільёна да дэнамінацыі). Тым, хто збіраецца ладзіць бізнес у сельскай мясцовасці, будуць выдаткоўваць па 2,6 тысячы. А пры арганізацыі прадпрымальніцтва з укараненнем навукова-тэхнічных распрацовак вас падтрымаюць па 3,5 тысячы рублёў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

■ Спорт-тайм

# ПРЫГОЖЫМІ БЫЛІ ТОЛЬКІ НУЛІ?

**Нашы клубы згулялі ўнічыю ў матчах 3-га кваліфікацыйнага раўнда Лігі Еўропы**

**У Жодзіне футбалісты «Тарпеда-БелАЗ» прымалі адзін з самых вядомых аўстрыйскіх клубаў — венскі «Рапід» і завяршылі сустрэчу ўнічыю 0:0. Госці дамінавалі на працягу ўсяго матча і нанеслі 14 удараў па варотах, але ўсе яны аказаліся не выніковымі.**

— У цэлым, для двухраўндавай барацьбы атрымаўся добры вынік. Наш сапернік — гэта хуткая, тэхнічная каманда. У аўстрыйцаў добры кантроль мяча, але за яго не даюць тры ачкі. У завяршальнай фазе мы не далі выніковa згуляць гасцям, — адзначыў **настаўнік жодзінскага клуба Ігар КРЫВУШЭНКА.**

Футбалісты мінскага «Дынама» таксама згулялі ўнічыю ў гасцявой сустрэчы 3-га кваліфікацыйнага раўнда Лігі Еўропы. У Нові-Садзе яны сустрэліся з сербскай «Вайводзінай». Госці прапусцілі гол на 29-й хвіліне і доўга не маглі зраўняць лік. Толькі ў канцы паядынку Яўген Буднік, які выйшаў на замену, аднавіў раўнавагу ў ліку — 1:1.Сустрэчы ў адказ адбудуцца 4 жніўня.

Нагадаем, раней барысаўскі БАТЭ ў стартавым паядынку 3-га круга кваліфікацыі адолеў на сваім полі футбалістаў з ірландскага «Дандолка» з мінімальным лікам 1:0. Паядынак барысаўчан у адказ адбудзецца 2 жніўня ў Дандолку.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

# АРТ-ФУТБОЛ У ЧАВУСАХ

Кожнаму, каму стала цікава, што можа быць агульнага паміж музыкай і футболам, трэба пабываць у гэтую суботу ў Чавусах. На гарадскім стадыёне магілёўскія артысты «Днепр-STARS» спачатку згуляюць у «Арт-футбол» з прадстаўнікамі мясцовай улады, а потым дадуць вялікі канцэрт. Гледачоў гэтага захапляльнага спартыўна-музычнага шоу чакае сустрэча з зоркамі магілёўскай эстрады Пашам Любчанкам, Алекшам Чорным, шоу-дуэтам «Про-баян», фіналісткай адборачнага тура міжнароднага дзіцячага конкурсу «Еўрабачанне» Вольгай Канавалавай.

Як паведамілі ў аддзеле па ідэалагічнай рабоце, культуры і па справах моладзі Чавускага райвыканкама, мерапрыемства прысвячаецца Году культуры і прапагандзе спорт.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Шпацыр па Камароўцы

# АБРЫКОСЫ ПА ЦАНЕ ЧАРНІЦ, ГАРБУЗЫ — ПА РУБЛЮ ЗА КГ

## Якія ягады на рынку самыя дарагія і самыя танныя?

**Лета ў самым разгары. У такую спёку хочацца харчавацца толькі ягадамі і садавінай. Наколькі жывыя вітаміны аблегчаць кашалёк?**


onliner.by

Нектарыны, персікі ды абрыкосы — гэта, бадай, «героі» сезона. Якія хочаш: і па памерах, і па колеры, і па «кандыцыі». Вядома ж, яны адрозніваюцца і па цане. Напрыклад, персікі з Македоніі аддаюць па 3 рублі 80 капеек, грэчаскія — за 4 рублі, а кілаграм крымскіх каштуе ажно 4 рублі і 50 капеек. Нектарыны з Іспаніі і Грузіі больш «дружныя», ідуць прыкладна ў адной цанавой планцы, якая не перавышае 4 рублі. Сярэдні кошт абрыкосаў складае 3 рублі 50 капеек.

Што цікава, куды даражэйшым выходзяць апельсіны: іх прапануюць па 4 рублі 50 капеек. Але хто шукае, той знойдзе неблагія плады па цане 1 рубель 80 капеек. Добра, што мы не бяром лімоны кілаграмамі: «кісляціна» ідзе ад 5 да 6 рублёў (дарэчы, для прахаладжальных напояў лімоны — сапраўдная знаходка). Але вернемся да ягад. На самую вялікую салодкую ягаду — кавун — устанавілася адна цана: рубель за кілаграм. За дыні давядзецца раскашэліцца. Паўсюль на прылаўках пазнакі «2 рублі» альбо «2 рублі 50 капеек» (за кілаграм, вядома ж).

Буякі — самая дарагая ягада на прылаўку. Ягады з лесу каштуюць 7 рублёў, з саду — 10-12 рублёў. Беларускія вішні каштуюць 4 рублі 50 капеек, а ўзбекскія чарэшні на рубель даражэйшыя. Паўлітровы слоік агрэсту каштуе 2 рублі 50 капеек. Лясныя чарніцы амаль утрымалі кошт з мінулага месяца — 3 рублі 20 капеек. Парэчкі ідуць па той жа цане. Кілаграм лясных малін стане вашым усяго за 9 рублёў. Слівы можна адшукаць за рубель і 30 капеек, хоць сярэдні кошт большы на 20 капеек.

Стаяць чэргі і па яблыкі — кіло польскіх грушавых каштуе 2 рублі 50 капеек. Чакаюць свайго пакупніка ківі — бяруць іх не вельмі ахвотна (кілаграм за 6 рублёў 50 капеек — цана аднаго плода авакада). Дадаўшы да гэтай сумы яшчэ два рублі, можна набыць кіло журавін альбо лісічак. Альбо паўлітра прыгожых, вялізных баравічкоў, якія так і просяцца на патэльню. У якасці альтэрнатывы заўжды ёсць вешанкі (5 рублёў за кіло) і шампіньёны (4 рублі за кіло).

Агуркі да летняй салаты знайшліся за рубель. А памідоры яшчэ давядзецца пашукаць, каб не пераплочваць. Сярэдні кошт на ўкраінскія і беларускія памідоры складае 2 рублі 30 капеек. Але ёсць і неверагодна дарагія таматы (дарэчы, беларускія): за кіло прадавец просіць не менш за 5 рублёў! Жоўтыя памідоры аддаюць па 4 рублі.

Баклажаны прадаюць па цане 1 рубель і 50 капеек. Прапануюць мясістыя балгарскія перцы па 2 рублі 50 капеек, але можна адшукаць і танней. Кіло маладой бульбы аблегчыць ваш кашалёк прыкладна на рубель. Буракі каштуюць 70 капеек, морква — рубель і 20 капеек, каляровая капуста — 2 рублі, пекінская — 2 рублі 50 капеек. Пучкі кропу, пятрушкі, зялёнай цыбулі, адзін перац чылі каштуюць 50 капеек, галоўка часнаку — 75 капеек.

**Кацярына РАДЗЮК.**
*radziuk@zviazda.by*

### ЛІЧЫЛЬНІК «ЗВЯЗДЫ»
*(цана за кілаграм, калі не пазначана іншае)*

**Сала салёнае — 10-12 р.**
**Свініна (кумпяк) — 7 р. 5 кап. — 10 р.**
**Свініна (рэбры) — 4 р. 24 кап.**
**Ялавічына (кумпяк) — 14 р.**
**Ялавічына (печань) — 5 р.**
**Цяляціна (кумпяк) — 18 р.**
**Кураня бройлернае — 3 р. 40 кап.**
**Індычка (фарш) — 7 р. 80 кап.**
**Бастурма — 20 р. 80 кап.**
**Паляндвіца — 20 р.**
**Кіндзюк — 23-26 р.**
**Каўбаса курыная — 7 р.**
**Бекон — 12 р.**
**Скумбрыя х/в — 15 р.**
**Селядзец слабасалёны — 5 р. 80 кап.**
**Яйка курынае Д-В (дзясятак) — 1 р. 60 кап.**
**Алей сланечнікавы рафінаваны (800 гр) — 2 р. 20 кап. — 2 р. 60 кап.**
**Грэчка (800 г) — 2 р. 24 кап. — 2 р. 70 кап.**
**Рыс доўгі (700 г) — 1 р. 10 кап.**
**Гарох колаты (700 г) — 1 р. 10 кап.**
**Фасоля чырвоная (800 г) — 3 р. 20 кап.**
**Грэцкі арэх ачышчаны — 15 р.**
**Арахіс смажаны — 8 р.**
**Курага — 20 р. — 24 р.**

■ Весткі з Кітая

# ПРЫЦЯГНЕННЕ ПАДНЯБЕСНАЙ



**Напрыканцы першага асенняга месяца ў Кітаі адбудзецца сапраўды знакавая падзея. 20 верасня ў горадзе Дуньхуане, што ў правінцыі Ганьсу, адкрыецца міжнародная культурная выстава-кірмаш «Шаўковы шлях».**

Як паведаміў удзельнікам Еўразійскага медыясемінара (журналісты з многіх краін свету зараз наведваюць шэраг рэгіёнаў Паднябеснай) сакратар КПК правінцыі Ганьсу Ван Саньюнь, свой удзел у мерапрыемстве ўжо пацвердзілі 58 краін.

Падчас правядзення выставы адбудзецца маштабная прэзентацыя ўнікальнай культуры старажытнай кітайскай цывілізацыі. Як вядома, з 6 тысяч кіламетраў Шаўковага шляху на тэрыторыю правінцыі Ганьсу прыпадае значная частка — 1,6 тыс. км. А цудоўны Дуньхуан, куды штогод прыязджаюць тысячы турыстаў, нездарма лічыцца жамчужынай на легендарным транспартным маршруце. Так што месца правядзення выставы было перадвызначана.

«Гэта мерапрыемства павінна з цягам часу стаць нацыянальным брэндам Кітая, — заўважыў Ван Саньюнь. — Яно маркуецца як маштабная платформа для актыўнага ўзаемавыгаднага культурнага абмену. Транснацыянальны праект «Адзін пояс, адзін шлях» павінен злучыць транспартна-лагістычнымі сувязямі многія дзясяткі краін. Пры гэтым не менш важна, што будзе адбывацца культурны, гуманітарны абмен паміж краінамі і народамі. У гэтым кантэксце форум у Дуньхуане набывае асаблівае значэнне».

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.** *litvinov@zviazda.by*


## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для строительства и обслуживания жилых домов в дер. Напалки, дер. Белая Лужа, дер. Крутая Гора и дер. Глинище Жодинского сельсовета Смолевичского района Минской области**

| | | |
|---|---|---|
| 1. | **Форма проведения аукциона** | Открытый |
| 2. | **Дата, время и место проведения аукциона** | **30 августа 2016 года в 10.00 г. Жодино, пер. Молодежный, 3 Жодинский сельисполком, кабинет №1** |
| 3. | **Продавец и его адрес** | Жодинский сельский исполнительный комитет, г. Жодино, пер. Молодежный, 3 |
| 4. | **Земельный участок, его кадастровый номер и адрес** | **Лот № 1** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881708801000094 в деревне Напалки, участок № 2<br>**Лот № 2** – земельный участок площадью 0,1500 га с кадастровым номером 624881701601000120 в деревне Белая Лужа, ул. Магистральная<br>**Лот № 3** – земельный участок площадью 0,1478 га с кадастровым номером 624881708101000031 в деревне Крутая Гора, участок № 1<br>**Лот № 4 –** земельный участок площадью 0,1497 га с кадастровым номером 624881708101000032 в деревне Крутая Гора, участок № 2<br>**Лот № 5** – земельный участок площадью 0,1499 га с кадастровым номером 624881708101000034 в деревне Крутая Гора, участок № 3<br>**Лот № 6 –** земельный участок площадью 0,1499 га с кадастровым номером 624881708101000033 в деревне Крутая Гора, участок № 4<br>**Лот № 7 –** земельный участок площадью 0,1206 га с кадастровым номером 624881704101000051 в деревне Глинище<br>**Лот № 8 –** земельный участок площадью 0,1298 га с кадастровым номером 624881704101000049 в деревне Глинище, участок № 1<br>**Лот № 9 –** земельный участок площадью 0,1305 га с кадастровым номером 624881704101000050 в деревне Глинище, участок № 2 |
| 5. | **Условия продажи** | Без изменения целевого назначения |
| 6. | **Целевое назначение земельного участка** | Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома |
| 7. | **Начальная цена продажи** | **Лот № 1** – 2500 рублей<br>**Лот № 2** – 4000 рублей<br>**Лот № 3** – 2500 рублей<br>**Лот № 4** – 2500 рублей<br>**Лот № 5** – 2500рублей<br>**Лот № 6** – 2500 рублей<br>**Лот № 7** – 5000 рублей<br>**Лот № 8** – 5000 рублей<br>**Лот № 9** – 5000 рублей |
| 8. | **Условия проведения аукциона** | Участниками аукциона могут быть граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие на территории республики или приравненные к постоянно проживающим в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь.<br>Аукцион считается состоявшимся при наличии не менее двух участников |
| 9. | **Наличие инженерной инфраструктуры** | **Лот № 2 (возможность электроснабжения)<br>Лоты № 7, № 8, № 9 (возможность электроснабжения, газоснабжения)** |
| 10. | **Сумма задатка и реквизиты продавца** | 10% от начальной цены земельного участка, р/с 3641000000263 в филиале №616 АСБ «Беларусбанк» г. Жодино, ул. 50 лет Октября, 25 «А», код 812, УНП 600023532 (с пометкой «Задаток за земельный аукцион») |
| 11. | **Порядок предварительного ознакомления в натуре с продаваемыми земельными участками** | каждую среду в 15.00 |
| 12. | **Окончательный срок приема заявлений** | **24 августа 2016 года** до 17.00 |
| 13. | **Контактные телефоны** | 8-01775 35-449, 8-01775 37-174, 8-01775 37-189 |

**Расходы по организации и проведению аукциона и затраты на публикацию информационного сообщения подлежат возмещению победителем аукциона.**

Примечания: для участия в аукционе в адрес продавца необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме.
2. Копии платежных поручений, заверенные банком, подтверждающие внесение задатка на расчетный счет продавца.
3. Документ (копию), удостоверяющий личность (паспорт) покупателя, или его доверенного лица.
4. Документ, заверенную нотариально (в случае, если на аукционе интересы покупателя представляет это лицо).